■ «Звязда» даследуе праблему

# У ГОСЦІ ДА ДЗЯДЗЬКІ КОСЦІ

## Ці з'явіцца ў музея імя Канстанціна Заслонава, які застаўся без пастаяннага месца прапіскі, асобны будынак?

**Наша газета ўжо пісала пра тое, што ліпеньскі ўраган, які нарабіў шмат шкоды на беларускай зямлі, пакінуў без даху і Мемарыяльны музей Героя Савецкага Саюза Канстанціна Заслонава ў Оршы. Па аб'ектыўных прычынах рэстаўрацыі не адбылося — будынак увогуле знеслі. Але, як запэўнілі мясцовыя ўлады і краязнаўцы, музей працягвае існаваць. Каб пераканацца ў гэтым, карэспандэнты «Звязды» выехалі ў Оршу.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Дырэктар Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны Уладзімір КУЗУБАЎ: «Нягледзячы на невялікія змены ў канцэпцыі, музей па-ранейшаму будзе насіць імя Канстанціна Заслонава».

На месцы адзінага ў свеце музея, прысвечанага Герою Савецкага Саюза, — цяпер пустка, акуратна пасыпаная пяскам, які выразна акрэслівае перыметр былога будынка. Драўляная хата, дзе больш як 60 гадоў знаходзіўся музей Заслонава, была пабудавана непадалёк ад чыгуначнага вакзала яшчэ да рэвалюцыі. Упершыню будынак згадваецца ў 1913 годзе як дом мясцовага святара, які жыў побач з вакзалам — там знаходзілася царква. Затым тут была бібліятэка. Экспазіцыя Мемарыяльнага музея імя Заслонава «пераехала» сюды ў красавіку 1952 года. Дагэтуль яна (згодна з рашэннем Савета Міністраў БССР музей быў створаны 1 жніўня 1948 года) размяшчалася ў Доме культуры чыгуначнікаў імя Кірава.

— Спецыялісты, да якіх мы звярнуліся пасля ўрагану, правялі аналіз будынка і выдалі дакумент, які сведчыць аб тым, што далейшая яго эксплуатацыя небяспечная, — гаворыць **дырэктар Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны Уладзімір КУЗУБАЎ**. — У кароткі час была арганізавана эвакуацыя экспанатаў. Ніводны музейны прадмет не быў пашкоджаны ўраганам, не страціў нічога і падчас пераезду. Будынак было вырашана знесці.

Экспазіцыя былога музея цяпер размяшчаецца за кіламетр-два адсюль. Аршанскі музей гісторыі і культуры горада, які, як і музей Заслонава, з'яўляецца філіялам Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны, выдзеліў пад экспанаты асобную экспазіцыйную залу. Тое, што не ўдалося змясціць у часовую экспазіцыю, захоўваецца ў фондасховішчы.

Як заверылі музейныя супрацоўнікі, у адным пакоі немагчыма размясціць усе экспанаты, якія раней займалі пяць залаў. У часовай экспазіцыі прадстаўлены найбольш значныя музейныя прадметы, звязаныя з лёсам героя Вялікай Айчыннай вайны. Але для першага знаёмства з дзядзькам Косцям, як называлі Заслонава партызаны, а таксама з подзвігамі заслонаўцаў дастаткова і гэтага.

Праўда, ёсць тут цікавае і для не навічкоў. З вуснаў **старшага навуковага супрацоўніка Мемарыяльнага музея Заслонава Ганны САСНОЎСКАЙ** у падрабязнасцях давялося даведацца, як рабіліся славутыя вугальныя міны, якімі заслонаўцы падарвалі 93 нямецкія паравозы. Аказалася, што падчас работы ў аршанскім дэпо ў гады вайны на будучага Героя, як на здрадніка, двойчы здзяйснялі замахі свае (вось гэта была канспірацыя!). Цікавасць выклікае інфармацыя, што немцы доўгі час не ведалі, што 14 лістапада 1942 года з групай партызан паў і іх адважны камандзір. Іначай як яшчэ растлумачыць той факт, што нават пасля гібелі Заслонава не здымалася ўзнагарода за яго галаву? Адным словам, часовая экспазіцыя створана не проста дзеля таго, каб быць. Толькі іншая справа, калі яна займае цэлы будынак...

Мясцовыя ўлады, якія з'яўляюцца заснавальнікамі музейнага комплексу, а значыць, і музея Заслонава, бачаць пакуль два варыянты вырашэння сітуацыі. Па-першае, музей можа з'явіцца на тым жа месцы, дзе ён знаходзіўся апошнія гады. Безумоўна, гэта патрабуе вялікіх матэрыяльных выдаткаў. Але ёсць прапанова аднавіць яго дзейнасць у цэнтры горада, па вуліцы Міра, у будынку, які знаходзіцца на балансе Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. У розны час у ім змяшчаліся жаночае рэальнае вучылішча, настаўніцкі інстытут імя Янкі Купалы і Аршанскі педагагічны каледж. Вялікі двухпавярховы дом плошчай амаль 2500 квадратных метраў, які цяпер пустуе, здольны змясціць не адну экспазіцыю.



Часовая экспазіцыя займае адзін пакой. Астатнія музейныя прадметы — у фондасховішчы.



Музей Заслонава можа аднавіць сваю дзейнасць у будынку, што ў цэнтры Оршы...



...або зноўку будзе пабудаваны перад гэтым палацам, дзе знаходзіўся апошнія больш як 60 гадоў.

— Канцэпцыя будучага музея ўжо існуе, — расказвае дырэктар Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны. — Хутчэй за ўсё, гэта будзе ваенна-гістарычны музей імя Канстанціна Заслонава, прысвечаны не толькі подзвігам брыгады дзядзькі Косці, а і ўвогуле гісторыі падпольнага і партызанскага руху ў нашым рэгіёне. Акрамя таго, новая экспазіцыя, магчыма, ахопіць падзеі войнаў XX стагоддзя, якія агнём і болем прайшлі праз аршанскую зямлю і ў якіх прымалі ўдзел аршанцы. У любым выпадку канчатковае рашэнне па экспазіцыі будзе прымацца з улікам пажаданняў нашчадкаў Героя Савецкага Саюза, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, жыхароў раёна і неабыякавых да сваёй гісторыі грамадзян. Нягледзячы на невялікія змены ў канцэпцыі, музей па-ранейшаму будзе насіць імя Канстанціна Заслонава.

Якім быць найстарэйшаму музею Оршы і аднаго з найстарэйшых музейных устаноў краіны, мы пагаворым падчас круглага стала, што ў хуткім часе адбудзецца ў рэдакцыі газеты «Звязда». Калі ў вас ёсць канкрэтныя прапановы ці пажаданні, пішыце на рэдакцыйную пошту *(220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а; info@zviazda.by)*

■

■ Гісторыя газеты — гісторыя краіны

# Невядомая біяграфія Ваціка

**Днямі раздаўся доўгачаканы званок. У рэдакцыю тэлефанавала Людміла Бярозкіна. Здавалася б, звычайная размова з чытачом, але каб не адна дэталь... Людміла Леанідаўна — пляменніца Вячаслава Нікіфарава, аднаго з рэдактараў падпольнай «Звязды».**

Каб расказаць пра сям'ю свайго знакамітага дзядзькі, неўзабаве яна прыехала ў рэдакцыю. Тое, што не ўвайшло ў афіцыйную біяграфію мінскага падпольшчыка і засталося па-за архіўнымі звесткамі, больш чым праз 70 гадоў давялося даведацца з першых вуснаў.

— Нарадзіўся Вячаслаў Нікіфараў у 1909 годзе ў горадзе Бахмач, што ў Чарнігаўскай вобласці, — расказвае Людміла Бярозкіна. — Мой дзед, Кандрат Пракоф'евіч, быў чыгуначнікам: у свой час скончыў Гомельскае чыгуначнае вучылішча. Любоў да чыгункі па спадчыне перадалася амаль усім яго сынам.

А іх у Кандрата і Яўгеніі Нікіфаравых было пяць. Акрамя таго, у сям'і выхоўваліся дзве дачкі, адна з якіх, Марыя, была прыёмнай.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, усе Нікіфаравы жылі ў Мінску — вярнуліся на гістарычную радзіму. Як толькі Вячаслаў уключыўся ў падпольную барацьбу з ворагам (а было гэта ў першыя дні акупацыі), іх кватэра па Чэрвеньскім тракце стала явачнай. Тут захоўвалася забароненая літаратура і зброя, не аднойчы збіраліся патрыёты, якія па ініцыятыве Ваціка, як называлі Нікіфарава спачатку ў сям'і, а потым і ў падполлі, стварылі групу «Нафтавікоў».

Разам з Вацікам у падпольнай рабоце ўдзельнічаў і яго брат. Аляксандр Нікіфараў працаваў у аўтарамонтных майстэрнях і часта выконваў заданні Вячаслава: збіраў і захоўваў зброю, распаўсюджваў лістоўкі, супрацоўнічаў з партызанамі. Аднойчы разам з падпольшчыкам Іванам Сёмінным яны вывезлі з Мінскага мясакамбіната 4 аўтамашыны мясакаўбасных вырабаў, а з Мінскага хлебазавода — больш як 20 тон хлеба. Шура быў павешаны падчас аднаго з публічных пакаранняў. Па словах нашчадкаў, было гэта 9 мая 1942 года на цяперашняй плошчы Свабоды. Гітлераўцы прынялі яго за Ваціка...

Дабраліся гітлераўцы і да Вячаслава. Праўда, перш разам з іншымі падпольшчыкамі ён паспеў выпусціць тры нумары «Звязды».

— Найбольш папулярная версія, што ён загінуў у Трасцянцы, — гаворыць пляменніца Нікіфарава. — Але ў свой час з маімі сваякамі сустракалася жанчына, якая ў 1943 годзе каля стадыёна «Дынама» бачыла сярод дзесяці павешаных падпольшчыкаў Ваціка.

Вядома, што Вячаслава Нікіфарава арыштавалі 25 верасня 1942 года: ён якраз здабываў апошнюю інфармацыю для пятага нумара падпольнай газеты, які так і не ўбачыў свет. Па афіцыйных звестках, пасля пакарання ў СД 8 снежня яго перавезлі ў мінскую турму. Пасля зноў — у СД, дзе пад чарговай порцыяй жудасных здзекаў яго прымушалі адмовіцца ад камуністычнай партыі. Далейшы лёс Вячаслава Нікіфарава невядомы.

Вялікая Айчынная адабрала ў бацькоў і трэцяга сына. Старэйшы Барыс, які прызваўся ў Чырвоную Армію ў 1939-м, загінуў у першыя дні вайны пры адступленні. Доўгі час ён лічыўся зніклым без вестак. Не так даўно нашчадкі даведаліся, што жыццё Барыса Нікіфарава абарвалася 24—25 чэрвеня 1941 года ў населеным пункце Васількава, што за 47 кіламетраў ад Беластока.



Фота Надзеі БУЖАН.

Пляменніца Вячаслава Нікіфарава ў рэдакцыі газеты «Звязда», дзе захоўваецца памяць аб яе дзядзьку, іншых людзях, якія выдавалі газету ў няпростыя для краіны часіны.

Невядомая магіла і прыёмнай дачкі Нікіфаравых. Марыя рана выйшла замуж. За яўрэя. Калі пачалася вайна, дачцэ Клары было 16 гадоў, сыну Карлу — 9.

— Паліцыя была частым госцем у кватэры бабулі і дзядулі, — расказвае Людміла Леанідаўна. — Марыя з дзецьмі жыла не разам з імі, але часта прыходзіла ў госці. Там Клара і трапіла на вочы гітлераўцам. Не дзіва, чорненькая, цёмненькая — відавочна, што яўрэечка. Дзяўчынку спрабавалі забраць. Маці заступілася і таксама трапіла пад падазрэнне. Разам з імі павезлі і малога Карла. Больш пра іх нічога не вядома. Хутчэй за ўсё, Марыю з дзецьмі спасціг такі ж лёс, як і многіх яўрэяў Мінска.

Іншым Нікіфаравым пашчасціла больш. Усевалада, які па заканчэнні Аршанскага чыгуначнага тэхнікума працаваў на магілёўскай чыгунцы, у 1937 годзе прызвалі ў Чырвоную Армію. Пасля службы ў Гомелі яму наканавана было прайсці дзве вайны: спачатку савецка-фінляндскую, затым Вялікую Айчынную. У складзе 1-га Беларускага фронту дайшоў да Берліна. У сямейным архіве і дагэтуль захоўваецца фотаздымак на фоне разгромленага рэйхстага.

Яшчэ адзін з братоў Нікіфаравых — Леанід, бацька Людмілы, — набліжаў Перамогу ў тыле. Яго вопыт спатрэбіўся на казанскай чыгунцы.

— Бацькава сястра Алена перад вайной выйшла замуж, — кажа пляменніца Вячаслава Нікіфарава. — З двума дзецьмі яна жыла ў бацькоў. Разам з імі двухпавярховы домік у раёне Нямігі, куды яны перасяліліся з-за частых вобыскаў і праследаванняў, дзяліў сын Усевалада (яшчэ двое дзяцей былі разам з жонкай у эвакуацыі). Усе тры гады акупацыі мае бабуля і дзядуля жылі ў атмасферы надзвычайнай асцярогі і неспакою. І не толькі таму, што ў падполлі знаходзіліся два іх сыны. Яны неслі адказнасць за малых дзяцей, сваіх унукаў, якія былі побач.

Штодзённае хваляванне і маральнае напружанне не прайшло дарма. Гібель чатырох дзяцей увогуле падкасіла Нікіфаравых. Глава сям'і, Кандрат Пракоф'евіч, усяго 10 дзён не дажыў да вызвалення Мінска...

Маці Вячаслава Нікіфарава, якую пасля вайны замучылі допытамі ўжо свае, дажывала век у Горкім, куды з мужам-франтавіком з'ехала дачка Алена. Яўгеніі Сямёнаўне выпала шчасце дажыць да таго моманту, калі сына прызналі адным з герояў падпольнага руху, даведацца аб тым, што яе Вацік пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Але галоўная ўзнагарода для маці, каб дзеці былі жывыя...

■

Матэрыялы падрыхтавала Вераніка КАНЮТА. kanyuta@zviazda.by